# ВАРЫЯЦЫІ



СВЯТЛАНЫ ГУТКОЎСКАЙ

Харэаграфія запатрабавана сёння як ніколі. У якасці аднаго са складнікаў фестывальных праектаў, відовішчаў, якія адбываюцца ў буйнейшых залах краіны. Асабліва гэта заўважна на тэлепраектах. За непрацяглай мініяцюрай — скрупулёзная праца харэографа.

Аўтар харэакампазіцыі мяркуе, што ў пэўныя моманты тэлеаператар выкарыстае «высокую кропку здымкі», уведзеную ў практыку ў сярэдзіне XX стагоддзя балетмайстрам Басбі Берклі. Бо менавіта зверху эфектна праглядаецца танцавальны малюнак і яго змены. Для буйных планаў харэограф рыхтуе выразныя позы, эмацыйныя жэсты. Думае і пра кантрасныя пераключэнні камеры з адных планаў на другія.

Што на самай справе? Недарэчна знятыя «мёртвыя зоны» працяглых паўз, калі пластычнае дзеянне адбываецца ў іншых зонах. Нам паказваюць твары вакалістаў, калі асноўная роля адведзена малюнку танца. А што ўжо казаць пра сцэнічныя ракурсы?! Цела артыста мае розную сэнсавую нагрузку ў залежнасці ад таго, паказаны ён з твару або са спіны. Але хіба гэта турбуе аператара?! Дзеянне разгортваецца ў цэнтры сцэны, а на экране — спіны выканаўцаў, якія знаходзяцца ля задніка. Пералік можна працягваць. У выніку сцэнічны твор змяняецца да непазнавальнасці.

Каб «карцінка» склалася і глядач убачыў высокамастацкі прадукт, неабходны зацікаўлены і прафесійны аператар, бо ён фактычна выступае суаўтарам твора, транслюемага на ТБ. Памятаю, падчас стажыроўкі ў Нью-Ёрку была здзіўлена, даведаўшыся, што для здымак харэаграфічных твораў кіна- і тэлеаператараў рыхтуюць спецыяльна і яны вывучаюць законы стварэння харэакампазіцыі. Ёсць і ў нас выдатныя майстры. Памятаю, як Святлана Пагарэльская з Віцебскага ТБ для здымак троххвіліннай мініяцюры ставіла на сцэне і ў зале 8 камер і прысутнічала на рэпетыцыях, каб «быць у матэрыяле».

Наш пастаноўшчык, які перажыў горыч няўдалай здымкі і не пазнаў на экране свайго твора, апускае рукі. Абыякавасць ці дылетантызм тэлеаператараў, што ігнаруюць законы запісу і паказу харэаграфічных твораў, вядуць да спрошчанага падыходу балетмайстраў. А ў пройгрышы, як заўсёды, застаецца глядач...■

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ